# Што такое сямейная медыяцыя і як яна можа дапамагчы сужэнствам

Аўтар: Кацярына Паўлоўская
07.11.2021 00:00



Паводле даных Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, у 2011 годзе Беларусь – краіна далёка не самая вялікая па колькасці насельніцтва – займала другое месца ў свеце па колькасці разводаў. На першым месцы знаходзілася Расія, на трэцім – Латвія. Па статыстыцы Белстата, у 2020 годзе ў нашай краіне зарэгістравана 50 384 шлюбы, разводаў жа – 35 144. У 2011 годзе ажанілася 86 785 пар, а развялося 38 584. Колькасць насельніцтва ў краіне ў абодва гэтых года была вельмі падобная.

Зыходзячы з таго, што сям'я – важная частка грамадства, даныя прымушаюць задумацца. Чаму людзі, якія жадалі быць разам, кахалі адзін аднаго, разыходзяцца? На думку медыятара Мікалая Хацяновіча, які правёў некалькі соцень сямейных медыяцый, пары часцей за ўсё заканчваюць свае адносіны не з-за асабістых якасцей аднаго з бакоў, а з-за асобных сітуацый, пасля якіх другая асоба не ведае, як далей заставацца разам.

Мікалай Хацяновіч у сферы сямейнай медыяцыі працуе ад пачатку існавання гэтай галіны ў Беларусі. Двойчы – у 2016 і 2017 гадах – мінскі Цэнтр медыяцыі і перамоў прызнаваў яго Медыятарам года.

Эксперт распавёў, як і чым медыятар можа дапамагчы ў вырашэнні спрэчак, чаму парам цяжка будаваць зносіны, а таксама падзяліўся некалькімі каштоўнымі лайфхакамі па будаванні неканфліктнай камунікацыі. †

Што такое сямейная медыяцыя?

Закон "Аб медыяцыі" быў прыняты ў Беларусі ў 2013 годзе, таму прафесія медыятара, у тым сямейнага, даволі маладая. Яго роля – дапамагчы вырашыць спрэчку, якая ўзнікла паміж бакамі падчас шлюбаразводнага працэсу альбо ў выніку яго. Да гэтай катэгорыі адносяцца таксама спадчынныя спрэчкі, спрэчкі паміж бакамі, якія знаходзяцца ў роднасных сувязях. Сямейная медыяцыя – гэта перамовы бакоў з удзелам нейтральнага

пасрэдніка з мэтай паляпшэння ўзаемадзеяння паміж бакамі і самастойнага вырашэння імі сітуацыі. Сямейных медыятараў няшмат. Спрэчкі ў гэтай сферы самыя складаныя і самыя эмацыянальныя.

Што датычыць спрэчак, звязаных са скасаваннем шлюбу, то каля 70% зваротаў – гэта накіраванні з суда. Такія спрэчкі датычаць, між іншым, аліментаў, раздзялення маёмасці, парадку адносін з дзецьмі, дачы дазволу на перапрапіску дзяцей, што патрабуе згоды абодвух бацькоў. У паведамленні аб прыёме іску аб скасаванні шлюбу, а таксама на кожным пасяджэнні суд рэкамендуе парам звярнуцца ў працэдуру медыяцыі для абмеркаваня пэўных момантаў. Падчас інфармацыйнай сустрэчы спецыяліст “дыягнастуе”, ці падлягае дадзеная сітуацыя вырашэнню працэдурай медыяцыі.

Як тлумачыць спадар Мікалай, у класічнай медыяцыі да невырашальных спрэчак адносяцца, напрыклад, выпадкі, калі ў пары выступала насілле. Хаця, на думку эксперта, няма немедыябельных спрэчак, бываюць толькі “недамовапздольныя людзі”. У выпадку пар, дзе ёсць насілле, спецыфіка працы іншая, але яна ўжо прымяняецца і дапамагае.

Медыятар адзначае важнасць згаданай інфармацыйнай сустрэчы. Яна не з’яўляецца пачаткам самога працэсу медыяцыі, але ўжо адыгрывае ролю “навучання камунікацыі”. Як правіла, дзякуючы інфармацыйнай сустрэчы бакі пачынаюць больш слухаць адзін аднаго, пачынаюць размаўляць, спрэчка становіцца больш зразумелай для іх саміх. Пасля ўдзельнікі вырашаюць, ці вярнуцца ў суд, ці “адысці ў працэдуру медыяцыі”. Вельмі частая сітуацыя, калі пасля адной гэтай сустрэчы з медыятарам бакі забіраюць іскі або вырашаюць не разводзіцца.

Паводле слоў спецыяліста, у большасці выпадкаў на нейкім этапе працэсу бакі вяртаюцца да медыяцыі, бо разумеюць, што “ў судзе не ўсё так проста”, а медыяцыя дапамагае калі ўжо і разысціся, то “па-чалавечы”.

Спадар Мікалай тлумачыць, што падчас працэдуры бакі могуць вырашыць усе спрэчныя пытанні і заключыць медыятыўнае пагадненне, якое мае юрыдычную сілу. Існуе таксама дадатковы бонус для матывацыі бакоў дамаўляцца – вяртанне даволі вялікай дзяржпошліны ў выпадку вырашэння спрэчкі. Як дзеліцца спецыяліст, пасля гэтага новаўвядзення зваротаў стала значна больш. “Калі ў 2015 годзе 15 зваротаў за год было нормай, то цяпер гэта больш за 150 медыяцый, больш за 200 інфармацыйных сустрэч”. Людзі хочуць ашчадзіць грошы, але “самае важнае, што ўсё-такі гэтая працэдура працуе”. Выканальнасць дамоўленасцей у медыяцыі дасягае 95%, паколькі бакі самі выпрацоўваюць іх. Рашэнні ж судоў выконваюцца толькі на 30%.


ИП
ООО
Один получает бизнес, другой денежную компенсацию или имущество, соответствующее по стоимости доле
Продажа бизнеса и раздел средств
Ликвидация бизнеса
Супруги остаются совместными владельцами
может быть